асацыятыўнай вобразнасцю, шырынёй выкарыстання мастацка-выяўленчых сродкаў.

Чуйная душа Л. Кебіч тонка ўспрымае адмоўныя і станоўчыя бакі жыцця, каханне і растанне, прыгажосць беларускай прыроды. Мастацкая тканіна рандэляў насычана мастацкімі сродкамі выразнасці: эпітэтамі, метафарамі, параўнаннямі, інверсіяй. У вершах выкарыстоўваецца паўтарэнне адных і тых жа слоў у пачатку радкоў – анафара, шматзлучнікавасць, шматпрыназоўнікавасць. Паўторы надаюць вершаванай мове асаблівую экспрэсію, узвышаюць тон, запавольваюць тэмп выказвання, робяць яго велічна-спакойным.

Л. Кебіч надае пастаянную ўвагу жанраваму пошуку, паказвае высокі ўзровень паэтычнага майстэрства, працягвае пашыраць абсягі літаратурных магчымасцяў сучаснай беларускай паэзіі.

У застыласці і статычнасці цвёрдых формаў адчуваюцца веліч, годнасць і прыгажосць. У вызначаным чаргаванні рыфмаў, пэўнай колькасці радкоў, у цвёрдай канструкцыі строфаў закладзена архітэктоніка стагоддзяў. Ужыванне класічных паэтычных формаў патрабуе ад паэта дасканалага ведання і адчуваня мовы.

Складаныя вершаформы не толькі не абмежавалі думку і пачуцці паэтэсы, але, дзякуючы ім, яны заблішчалі і заіскрыліся словамі і радкамі, як аграненыя дыяменты.

УДК 398.4

Вуч. Н. Д. Конік, М. В. Уласевіч
Навук. кір. Г.А. Барысевіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(“ДУА “Гімназія № 19 г. Мінска”)

## СУЧАСНАЕ АСЭНСАВАННЕ ВОБРАЗАЎ БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІІ

Чым больш грамадства тэхнічна развіваецца, тым складаней звычайнаму чалавеку ўсведамляць сутнасць навуковых дасягненняў. Таму назіраецца ўзрастанне цікавасці людзей да містычнага, фантастычнага і непазнанага. На пачатку XXI стагоддзя пра гэта сведчыць увага грамадства да духоўных праблем, да таямніц чалавечай псіхікі, а таксама зближэнне навукі, рэлігіі і міфалогіі. Традыцыйная беларуская міфалогія і сёння забяспечвае сувязь чалавека з блізкім бытавым асяроддзем.

Мэта нашай работы – даследаванне навуковых крыніц па тэме, высветленне эвалюцыі некаторых папулярных міфалагічных вобразаў,

вызначэнне спецыфікі выкарыстання міфалагічных вобразаў у сучаснай літаратуры для дзяцей і падлеткаў.

У нашым даследаванні мы абапіраліся на навуковыя працы Ненадаўца А.М., Вугліка І.Д., Васілевіча У.А, Коваля У.І., Крука І.І. Шамака А.А., Шамякінай Т.І.,

**Табліца 1 – Асаблівасці беларускай міфалогіі**

| | |
|---|---|
| 1. | Адна з самых старажытных, адносіцца да групы індаеўрапейскіх славянскіх міфалогій. |
| 2. | Аптымістычны погляд на жыццё: лічылася, што душу мая любая жывая істота, усё круціцца да бясконцасці, канца свету няма. |
| 3. | Спалучэнне хрысціянства і язычніцтва, хрысціянскія персанажы ўзялі функцыі паганскіх багоў. |
| 4. | Міфічныя персанажы, нават нячысцікі, падобныя да людзей. |
| 5. | Персанажы беларускай міфалогіі прыземленыя і неагрэсіўныя, большасць багоў – носьбіты лепшых чалавечых якасцей, духі – не вельмі страшныя і шкодныя істоты. |
| 6. | Самы галоўны абярэг ад злых сіл – сумленнае жыццё |

Выхаваўчы патэнцыял відавочна вялікі. Пагэтаму міфалогія працягвае існаваць і сёння, набываючы розныя іншыя формы [4, 5]. Напрыклад:

| | |
|---|---|
| Бог | Закон |
| Яго слугі | Спецагенты, суддзі, вайскоўцы і г.д. |
| Папулярны сюжэт | Герой перамагае (забівае) злачынца, прышэльца, пачвару |
| Свяшчэнныя персанажы | Спартсмены, прадстаўнікі поп-культуры, музыкі, палітычныя лідары |
| Духі | Прадметы тэхнікі (напрыклад, камп’ютар) |
| Папулярная навука | Уфалогія |

Беларуская міфалогія багатая на каларытныя вобразы. Паводле анкетавання вучняў нашай гімназіі, мы выбралі самыя папулярныя і даследавалі іх эвалюцыю (таблица 2). У апошні час з’яўляюцца шматлікія літаратурныя творы, натхнёныя народнымі павер’ямі, ствараюцца розныя варыяцыі на міфічныя сюжэты ў кіно, тэатры, выяўленчым мастацтве, камп’ютарных гульнях і іншым.

Дзеці і падлеткі – самыя шчырыя прыхільнікі казачных сюжэтаў і герояў. Яны атаясамліваюць сябе з міфалагічнымі вобразамі, імкнуцца быць да іх падобнымі. Беларуская літаратура для дзяцей і падлеткаў шырока выкарыстоўвае міфалагічныя вобразы і сюжэты. Мы вызначылі спосабы апрацоўкі і выкарыстання аўтарамі вобразаў і сюжэтаў беларускай міфалогіі. Аўтары разгледжаных намі твораў перарабляюць беларускія міфы, перамешваюць розныя матывы і вобразы.

**Табліца 2 – Эвалюцыя папулярных жаночых міфалагічных вобразаў**

| Міфалагічны вобраз | Першапачатковае значэнне | Эвалюцыя | Сучаснае асэнсаванне |
|---|---|---|---|
| Баба-Яга | Багіня, першапродак жанчын, змяя (5 версій паходжання імя) | Уладарка замагільнага свету, гаспадыня ведзьмаў, людаедка, хвароба | Казачны персанаж: злая чараўніца або памочнік для казачнага героя |
| Кікімара | Продак – дагістарычная жывёліна. Кік (“гарбатасць”) + Мор (“смерць”) = КІКІМАРА | Увасабляла заўчасна загінуўшую дзяўчынку; нячысцік шкодны дух, які жыве ў хаце і робіць беспарадкі | Фразеалагізм “кікімара балотная”; адмоўны казачны персанаж, якога ніхто ўжо не баіцца |
| Русалка | Памерлае ці загубленае нехрышчонае дзіця ці маладая тапельніца, што скончыла жыццё самагубствам; злы дух-мярцвяк; | азярніцы, мужчыны-русалкі; спрыялі ўрадлівасці жытнёвай нівы, адзначалася свята – Русальны тыдзень | прывабным і шчодралюбным казачны персанаж |

У рабоце мы даследавалі эвалюцыю некаторых вобразаў беларускай міфалогіі ад старажытнасці да нашага часу, іх сучаснае асэнсаванне і высветлілі, што старажытныя вобразы дайшлі да нас у зменены выглядзе, іх сімволіка змянілася, страціўшы свой містычны сэнс. Зараз міфічныя вобразы набылі значэнне мастацкіх метафар і сімвалаў, працягваюць існаванне ў беларускай мове і літаратуры. Беларуская міфалогія служыць багатай крыніцай для аўтарскай фантазіі і спрыяе ўзнікненню новых казачных персанажаў, аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне светапогляду сучаснага чалавека, асабліва дзіцяці. Міфы пасылаюць нам сігнал-напамін: што дабро павінна перамагаць, а зло – быць пакарана, вучаць адказнаму стаўленню да сям’і, да працы, да прыроды.